# ГАННА ГЕРЫЧ ЯК МЕМУАРЫСТВА

*Гарбачова В.*

Успаміны, прысвечаныя апісанню побыту і звычаяў беларускай шляхты канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. Ганна Герыч, пляменніца Тадэвуша Рэйтана, распачала пісаць на французскай мове ў 30-я гады і завершыла гэтую справу ў 1856 г., пераклаўшы свае нататкі на польскую мову.

На сённяшні дзень мемуары Ганны Герыч захоўваюцца ў фондах Музея Адама Міцкевіча і Польскай бібліятэкі ў Парыжы. Матэрыялы з Польскай бібліятэкі часткова пабачылі свет, а дакументы з Музея Адама Міцкевіча, якія прадстаўляюць сабой чарнавыя запісы, толькі з нядаўняга часу пачалі апрацоўвацца і выдавацца. Рукапісы, якія нас цікавіць, утрымліваюцца ў справе пад нумарам 1031. Яна складаецца з чатырох асобных сшыткаў, уключаючых розныя матэрыялы: «Kontynuacja wspomnień Litewskich» (14 аркушаў), «Urywek z dziennika z 1844 r.» (73 аркуша), апісанне кіравання самой Г. Герыч маёнткам Ішкалдзь (24 аркуша) і «Urywki z pamiętników» (4 аркуша).

Адной з постацяў, якая закранаецца мемуарысткай – гэта Тадэвуш Рэйтан. Аўтарка працягвае справу Ф. Князьніна, Г. Ржэвускага, Ю.У. Нямцэвіча і інш. па папулярызацыі і закладанню культа свайго знакамітага сваяка. Адначасова ў нарацыях аўтаркі мажліва прасачыць некалькі цікавых для гісторыкаў момантаў:

-у Грушаўцы ўтрымліваліся шматлікія архіўныя дакументы, якія, як лічыцца, загінулі ў перыяд Першай сусветнай вайны;

-выкарыстаная У.Ю. Нямцэвічам для напісання жыццярысу Т. Рэйтана копія дыярыуша можа лічыцца не дакладнай;

-у Грушаўцы існавала практыка капіявання найбольш каштоўных дакументаў з архіва Тадэвуша Рэйтана.

Частка нататкаў мемуарысткі прысвечана жыццю ліцвінскай эміграцыі ў Парыжы, куды яна перабіраецца ў 1837 г. Сярод эмігрантаў за ёй замацоўваецца арэол узорнай маці-полькі, што дазваляе завязаць кантакты з Адамам Міцкевічам, Антоніям Гарэцкім, Севярынам Гашчынскім, Андрэем Тавянскім, Леанардам Ходзькай, Аляксандрам Бергелем і іншымі. Гэта знаходзіць адлюстраванне ў яе ўспамінах, датаваных 1844 г. Аўтарка прыпыняецца на падзеях, звязаных з чытаннем курса лекцый, чытаных Адамам Міцкевічам у Калеж дэ Франс, з дзейнасцю Андрэя Тавянскага і іншых аспектах эміграцыйнага жыцця.